За парогам манастыра засталася прыгажуня Прадслава, а замест яе з'явілася асветніца і кніжніца Еўфрасіння. Спачатку яна адзінока перапісвала і перакладала кнігі ў Сафійскім саборы. А калі бацька пабудаваў ёй пад Полацкам манастыр, перайшла ў яго: з цягам часу там пачалі працаваць школы і дзейнічаць майстэрні па перапісванню кніг. З таго часу ўсе, пакрыўджаныя жыццём, знаходзяць прытулак у манастырскіх сценах, вучацца грамаце, і слава вялікая ідзе пра манастыр. Еўфрасіння знаходзілася ў цэнтры духоўнага жыцця Полацкага княства, яна нястомна збірала вакол сябе таленавітых людзей, стала нашай першай мецэнаткай. Па яе заказу дойлід Іаан пабудаваў сусветна вядомую царкву Спаса, майстар-ювелір Лазар Богша зрабіў для Еўфрасінні свой слынны крыж - першы неацэнны твор старажытнабеларускага мастацтва.

Еўфрасінню Полацкую кананізавалі першай сярод усходнеславянскіх жанчын, бо была яна заступніцай пакрыўджаным, затураным нясла суцяшэнне, распранутым -адзенне, хворым - наведванне ці, проста кажучы, для ўсіх была ўсім...



Складальнік:
Сухоцкая І.А.

Камп’ютарная апрацоўка:
Свірыдава С.В.

Роская гарпасялковая бібліятэка

500 гадоў беларускаму кнігадрукаванню

# Праз смугу стагоддзяў дайшло да нас слова



2017

У 1994 годзе ў нашай краіне ўпершыню адзначаўся Дзень беларускага пісьменства і друку. У аснову гэтага свята пакладзена ідэя асэнсавання гістарычнага шляху пісьменнасці і друку на Беларусі, павышэнне яго ролі і значэння ў духоўным жыцці грамадства. А шлях гэты пралягае ад часоў увядзення хрысціянства на беларускай зямлі і да сённяшніх дзён.

Першай сталіцай нацыянальнага свята быў Полацк – калыска беларускай дзяржаўнасці і культуры, горад, звязаны з імёнамі першай асветніцы Еўфрасінні Полацкай і першадрукара Францыска Скарыны.



***Францыск Скарына*** нарадзіўся ў 1490 годзе ў Полацку ў сям'і купца Лукі Скарыны. Пачатковую адукацыю атрымаў у Полацку і, як сведчаць даследчыкі, у Вільні. Вучыўся на філасофскім факультэце Кракаўскага ўн1версітэта, дзе атрымаў вучоную ступень бакалаўра філасофіі.

У 1512 годзе атрымаў у Падуанскім універсітэце ступень доктара медыцыны. Меў таксама ступень доктара вольных навук. У 1517-1519 гадах надрукаваў 23 кнігі Бібліі.



Златоуст, паче всех воссиявший нам на Руси», - так нашы далёкія продкі называлі ***Кірылу Тураўскага.*** Хлапчук Кірыла, які з'явіўся на свет у стольным горадзе Тураве, стаў вядомы стагоддзям як асветнік, паэт, філосаф, прапаведнік. Будучы асветнік нарадзіўся ў сям'і мясцовага баярына, блізкага да княжага двара. Свецкае імя яго не захавалася, у гісторыю ён увайшоў пад імем, якое прыняў пры пастрыгу - Кірыла. Юнак рана пачаў праяўляць здольнасці да навукі і атрымаў выдатную па тых часах адукацыю. Даволі рана ён пастрыгся ў манахі. Каля 1145 г., калі Кірылу было пад трыццаць гадоў, ён становіцца настаяцелем манастыра.

Але праз некаторы час ён пакідае абіцель і пасаду настаяцеля манастыра і выказвае жаданне стаць «стоўпнікам» - замуравацца ў адной з манастырскіх веж. Існуе меркаванне, што праз некаторы час асветнік адмовіўся ад епіскапскай кафедры і жыў у адзіноце. У XIII ст. ён быў кананізаваны. Кірыла Тураўскі пакінуў значную і разнастайную спадчыну. Да яе адносяцца «Словы " якія прамаўляліся падчас святаў, прытчы. паданні, пасланні, малітоуныя каноны і іншыя. Да нас дайшлі 60 твораў Кірылы.



***Еўфрасіння Полацкая*** - унучка славутага полацкага князя Усяслава Чарадзея. Без гэтага імені немагчыма ўявіць не толькі духоўнае жыццё на ўсходнеславянскіх землях у XII ст., але і ўсю шматвяковую гісторыю Беларусі. Выбіраючы свой лёс яна выбірае манастыр.